МВД СССР обучался выдающийся ученый-криминалист Николай Иванович Порубов, также успешно защитивший в 1961 г. кандидатскую диссертацию по теме «Дознание по делам о насильственной смерти на железнодорожном транспорте». Эти ученые были направлены на педагогическую работу в Минск, где после образования Минской высшей школы МВД Л.Н. Калинкович возглавил кафедру оперативно-розыскной деятельности ОВД, а Н.И. Порубов – кафедру криминалистики.

После создания в 1965 г. Всесоюзного научно-исследовательского института охраны общественного порядка при МООП РСФСР в его структуре также была образована адъюнктура. Дальнейшее расширение системы ведомственной подготовки научных работников высшей квалификации связано с созданием в 1970 г. адъюнктуры в Киевской высшей школе МВД СССР. В 1977–1980 гг. в этой адъюнктуре обучался Иван Игнатьевич Басецкий, защитивший в 1980 г. кандидатскую диссертацию на тему «Теоретико-правовые, этические и организационно-тактические проблемы оперативной работы службы БХСС». После создания в 1975 г. Московской высшей школы милиции МВД СССР в ее структуре также была создана адъюнктура, которую успешно окончил в 1983 г. с защитой кандидатской диссертации по теме «Условия эффективности общей профилактики преступлений, осуществляемой органами внутренних дел в крупном городе» Валерий Антонович Ананич.

Как отмечает российский исследователь системы милицейского образования профессор М.А. Кожевина, с начала 70-х гг. XX в. руководством МВД СССР проводилась планомерная унификация организации образовательного процесса и научно-исследовательской деятельности в ведомственных учреждениях образования с общегосударственными требованиями. Это непосредственно отразилось и на подготовке научных работников высшей квалификации. В то же время МВД СССР жестко контролировало план набора адъюнктов (для каждого учреждения высшего образования и научной организации определялась соответствующая квота), согласовывало тематику диссертационных исследований, подавляющее большинство из которых носило практико-ориентированный характер, и т. п. Более того, в 1975 г. значительно повышен статус Высшей аттестационной комиссии (ВАК), которая стала действовать при Совете Министров СССР. Изменился порядок аттестации соискателей ученых степеней, выразившийся, в частности, в создании специализированных советов по защите диссертаций. Одной из ключевых функций ВАК стало участие совместно с Госпланом СССР, Государственным комитетом Совета Министров СССР по науке и технике, Академией наук СССР, Министерством высшего и среднего специального образования СССР, другими министерствами и ведомствами в



планировании подготовки научных работников высшей квалификации, а также в совершенствовании деятельности аспирантуры.

По мере увеличения научного потенциала учреждений высшего образования МВД СССР в их структуре не только создавались адъюнктуры (например, в 1981 г. адъюнктура была создана в Омской высшей школе милиции МВД СССР, в 1988 г. – в Рязанской высшей школе МВД СССР, а в 1990 г. – в Горьковской высшей школе МВД СССР), но и открывались специализированные советы по защите диссертаций. В 1982 г. такой совет был создан в Киевской высшей школе МВД СССР.

Таким образом, становление адъюнктуры в системе органов внутренних дел СССР происходило в условиях как преобразования советской системы подготовки и аттестации научных работников высшей квалификации, так и расширения сети ведомственных учреждений высшего образования и научных организаций. При этом адъюнктура создавалась только при наличии достаточного научного потенциала, который гарантировал качественное научное руководство соискателями ученых степеней.

УДК 351.74 (476) (091)

***І.А. Саракавік***

## ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ГРАШОВА-МАТЭРЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ СУПРАЦОЎНІКАЎ МІЛІЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Пытанне аб праваым рэгуляванні грашова-матэрыяльнага забеспячэння супрацоўнікаў міліцыі мае не меншае значэнне, чым аб службовай іх дзейнасці. Гэта само па сабе зразумела. У розныя перыяды гісторыі Беларусі яно вырашалася неадназначна, залежала ад шэрагу фактараў унутранага становішча дзяржавы.

Адным з першых актаў па адзначанаму пытанню з'явілася па даручэнню ўрада пастанова Наркамата ўнутраных спраў РСФСР (НКУС) ад 28 кастрычніка (10 лістапада) 1917 г. «Аб рабочай міліцыі» Дадзеная пастанова НКУС заклала прававыя асновы будаўніцтва савецкай міліцыі. Невыпадкова пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 17 жніўня 1962 г. № 900-387 дзень 10 лістапада быў абвешчаны штогадовым святам – Днём савецкай міліцыі. Гэта рашэнне было юрыдычна замацавана Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 верасня таго ж года.

Непасрэдным актам, закранаючым клопат савецкай улады аб супрацоўніках міліцыі, стала пастанова НКУС РСФСР ад 19 верасня

1918 г. «Аб пашырэнні на членаў і служачых міліцыі дзеяння Палажэння аб страхаванні на выпадак беспрацоўя і Палажэння аб страхаванні на выпадак хваробы». Згодна з ёй усе служачыя і работнікі савецкай міліцыі падлягалі на агульных падставах забеспячэнню ў выпадках хваробы, няшчасных здарэнняў, старасці і інваліднасці нароўні з усімі працоўнымі.

Загадчыкі аддзелаў кіравання мясцовых выканкамаў і начальнікі міліцыі павінны былі адрэгуляваць з мясцовымі страхавымі касамі ці аддзеламі працы мясцовых Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў пытанне аб прыпісцы міліцыянераў да бальнічных кас, што тычылася забеспячэння ў гэтай галіне.

Пры складанні каштарысаў на савецкую міліцыю ў іх павінны былі ўключацца ў адпаведнасці з пастановай «Аб парадку прымянення палажэнняў аб страхаванні на выпадак беспрацоўя і хваробы» выдаткі па ўплаце працэнтных узносаў у бальнічныя касы.

Важнае значэнне мела Інструкцыя аб арганізацыі савецкай рабоча-сялянскай міліцыі, выдадзеная 12 кастрычніка 1918 г. НКУС і НКЮ РСФСР. У ёй адзначалася, што склад, колькасць і аклады членаў савецкай міліцыі, служачых канцылярыі і выдаткі па арганізацыі і аплаце атрадаў міліцыі вызначалі павятовыя і гарадскія Саветы. Выпрацаваныя імі нормы зацвярджаліся выканкамам губернскага Савета і НКУС (п. 8).

Фінансаванне павятовай і гарадской міліцыі адбывалася за кошт як дзяржаўнага казначэйства па каштарысу НКУС, так і мясцовых Саветаў (п. 9).

Усе члены міліцыі пры выкананні службовых абавязкаў павінны былі насіць устаноўленую форму ці вызначальны знак, мець халодную зброю і рэвальверы (п. 11–12).

Складанае ўнутрыпалітычнае становішча Савецкай дзяржавы вымусіла СНК РСФСР прыняць 3 красавіка 1919 г. Дэкрэт «Аб савецкай рабоча-сялянскай міліцыі». У ім, у прыватнасці, адзначалася, што ўтрыманне ўсіх відаў міліцыі НКУС дзяржава брала на свой кошт.

Міліцыянеры, агенты крымінальнага вышуку і асобы каманднага складу міліцыі мабілізаваліся для нясення службы ў Чырвоную Армію, але заставаліся на сваіх месцах і лічыліся прыкамандзіраванымі да аддзелаў кіравання. З іх НКУС абавязваўся $^1/_3$ міліцыянераў і $^1/_5$ частку асоб каманднага складу пастаянна трымаць у дзеючай арміі. Міліцыянеры і камандны склад міліцыі залічваліся на харчаванне на тылавы чырвонаармейскі паёк, за наяўны разлік па цвёрдых цэнах. Абмундзіраванне яны атрымлівалі за кошт дзяржавы.



Улічваючы значнасць і ролю савецкай міліцыі ў падтрыманні грамадскага парадку і ў барацьбе са злачыннасцю, Дэкрэт УЦВК ад 10 чэрвеня 1920 г. зацвердзіў Палажэнне аб рабоча-сялянскай міліцыі. Згодна з ім у склад міліцыі НКУС уваходзілі гарадская, павятовая, прамысловая, чыгуначная, водная (рачная, марская), вышуковая міліцыя. Як узброенаму выканаўчаму органу, міліцыі прысвойвалася значэнне ўзброеных часцей асобага прызначэння. Таму забеспячэнне міліцыі абмундзіраваннем, зброяй, харчамі ажыццяўлялася ў парадку, устаноўленым для забеспячэння арміі. Іншымі словамі, матэрыяльнае забеспячэнне міліцыі было прыроўнена да армейскага. Гэта аказала істотны ўплыў на камплектаванне органаў міліцыі не толькі ў адзначаны час, але і на будучае.

3 кастрычніка 1927 г., а затым 11 лістапада гэтага ж года УЦВК і СНК РСФСР прынялі дзве пастановы аб паляпшэнні матэрыяльнага становішча работнікаў міліцыі: уводзіліся дадатковыя льготы, павышалася заработная плата, устанаўлівалася працэнтная надбаўка да акладу за выслугу гадоў, вызначаліся меры па сацыяльнаму страхаванню, паляпшэнню жыллёва-бытавых умоў.

З улікам адзначаных рашэнняў УЦВК і СНК РСФСР 13 снежня 1927 г. СНК БССР прыняў пастанову аб устанаўленні шэрагу льгот супрацоўнікам міліцыі. Да прыкладу, за імі захоўваліся зямельныя надзелы на час нясення службы. Нароўні з вайскоўцамі яны карысталіся льготамі пры размеркаванні зямель запаснога фонду, атрыманні лесу, сельскагаспадарчых сродкаў і машын з пракатных пунктаў.

На наступны дзень, 14 снежня 1927 г., ЦВК і СНК БССР прынялі чарговую пастанову «Пра захады да паляпшэння быту і службы работнікаў рабоча-сялянскай міліцыі». Яна пашырала і паляпшала грашова-матэрыяльнае забеспячэнне супрацоўнікаў міліцыі. Для іх устанаўлівалася перыядычная надбаўка да асноўнага акладу заработнай платы. Прадугледжваліся дзяржаўнае страхаванне на выпадак смерці або інваліднасці пры выкананні службовых абавязкаў, выдзяленне сродкаў на будаўніцтва.

Наступным крокам у гэтым кірунку стала пастанова ЦВК і СНК БССР ад 14 жніўня 1928 г., якая канкрэтызавала пастанову ЦВК і СНК БССР ад 14 снежня 1927 г. У адпаведнасці з ёй устанаўліваліся надбаўкі да заработнай платы работнікам страявога складу міліцыі і актыўнага складу крымінальнага вышуку за выслугу гадоў: за бесперапынную службу на працягу 3 гадоў – 10 %, 6 гадоў – 20 %, 9 гадоў – 30 %. Дзеянне пастановы пашыралася на малодшых міліцыянераў, агентаў крымінальнага вышуку, малодшы і сярэдні начальніцкі склад надворнай і прамысловай міліцыі і крымінальнага вышуку.

Па тым часе заслугоўвае ўвагі і пастанова СНК БССР ад 23 студзеня 1929 г. «Пра ўтварэнне фонду спецыяльных сродкаў для паляпшэння быту работнікаў міліцыі». У складаным сацыяльна-эканамічным становішчы рэспублікі было вырашана нестандартным па тым часе шляхам пытанне наконт паляпшэння грашова-матэрыяльнага палажэння міліцыі. Сутнасць гэтай пастановы заключалася ў наступным. Штрафы, што спаганяліся за незаконны выраб, захаванне і збыт спіртных напіткаў і спіртаўтрымліваючых рэчываў, залічваліся ў бюджэты акруговых выканкамаў і выдаткоўваліся па каштарысу, які складаўся начальнікам адміністрацыйнага аддзела, зацвярджаўся прэзідыумам акруговага выканкама, на адначасовую дапамогу сем'ям тых работнікаў міліцыі, якія загінулі, а таксама цяжка хварэлі; на паляпшэнне быту ў час водпуску; на адпраўку хворых на курорты і ў дамы адпачынку; на паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў (набыццё пасцельных прынадлежнасцяў, абсталяванне інтэрнатаў і г. д.), узмацненне барацьбы з патаемным вінакурствам (арт. 1).

Пры адміністрацыйных аддзелах акруговых выканкамаў утвараўся фонд спецыяльных сродкаў для паляпшэння быту работнікаў міліцыі, у які залічваліся ўсе адлічэнні са штрафных сум, апрача адзначаных у арт. 1, што спаганяліся ў судовым і адміністрацыйным парадку і ішлі, паводле дзеючых законаў, на прэміраванне работнікаў міліцыі (арт. 2). 25 працэнтаў сродкаў фонду прызначалася на жыллёвае будаўніцтва для супрацоўнікаў міліцыі, а 75 працэнтаў – на вядзенне культурна-асветніцкай працы, матэрыяльную дапамогу асобным работнікам міліцыі, якія праявілі выключную ініцыятыву і самаахвярнасць у змаганні са злачыннасцю і ў іншых галінах дзейнасці міліцыі, а таксама тым, хто хварэў (ці членам сям'і); на пасыланне для лячэння і ў дамы адпачынку (арт. 3).

Распараджэнне фондам даручалася начальнікам адміністрацыйных аддзелаў пасля ўзгаднення з акруговымі выканкамамі і пад агульным наглядам НКУС БССР (арт. 4).

Характэрна, што ў цяжкіх умовах канца 1980-х гг. і ў першыя гады дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь, калі працоўныя калектывы высвятлялі, каму з іх дастанецца права купіць тую ці іншую рэч, бо на ўсіх не хапала, меўся вялікі дэфіцыт, у некаторых міліцэйскіх калектывах гучалі прапановы вярнуцца да 1920-х гг.: частку канфіскаванай маёмасці ў якасці прэміі перадаць тым супрацоўнікам міліцыі, хто дабіўся найлепшых вынікаў па службе. Аднак такая прапанова не была падтрымана.

У пачатку 1930-х гг. па разглядаемаму пытанню прадстаўляе цікавасць Палажэнне пра рабоча-сялянскую міліцыю і крымінальны вышук БССР (далей – Палажэнне). Яно было зацверджана 27 лютага 1930 г. ЦВК і СНК БССР. Палажэнне юрыдычна замацоўвала ранейшае



грашова-матэрыяльнае забеспячэнне супрацоўнікаў міліцыі. Так, арт. 9–10 Палажэння прапісвалі права супрацоўнікаў страявога, актыўнага і адміністрацыйна-гаспадарчага складу міліцыі і крымінальнага вышуку на час службы бясплатна атрымоўваць форменнае абмундзіраванне, захоўваць і насіць пры сабе халодную і агнястрэльную зброю.

Не меншае значэнне мела Палажэнне аб рабоча-сялянскай міліцыі, якое зацвердзіў СНК СССР 25 мая 1931 г., і якое дзейнічала да 1962 г. У прыватнасці, у ім адзначалася, што памер зарплаты для супрацоўнікаў міліцыі ўстанаўліваўся СНК СССР для органаў міліцыі ўсяго Савецкага Саюза. Прадугледжваліся перыядычныя прыбаўкі да заробленай платы за выслугу гадоў у наступных памерах: за 3 гады бесперапыннай службы – 10 працэнтаў, за 6 гадоў – 20, за 9 гадоў – 30 і за 12 гадоў – 50 працэнтаў асноўнага аклада па займаемай у дадзены момант пасадзе (арт. 41–42). 27 лютага 1930 г. ЦВК БССР і СНК БССР у сувязі з саюзнай пастановай ад 25 мая 1931 г. пастанавілі скасаваць Палажэнне аб рабоча-сялянскай міліцыі і крымінальным вышуку БССР.

Такім чынам, разглядаемае пытанне дазваляе заключыць наступнае:

1. Прававое рэгуляванне грашова-матэрыяльнага забеспячэння супрацоўнікаў міліцыі Беларусі ў міжваенны перыяд не было адназначным. Яно ажыццяўлялася на аснове тых грамадскіх адносін, якія складваліся па меры развіцця найперш сацыяльна-эканамічных адносін. Па меры эканамічных поспехаў прыкметна паляпшалася і ўтрыманне супрацоўнікаў міліцыі. Калі першапачаткова яны забяспечваліся як з бюджэту Наркамата ўнутраных спраў і мясцовых Саветаў, то з часам дзяржава поўнасцю ўзяла на сябе грашова-матэрыяльнае ўтрыманне міліцыі.

2. Важным для паляпшэння кадравага склада міліцыі, а значыць і ўдасканалення дзейнасці міліцыі, стала рашэнне савецкай улады аб ураўнаванні грашова-матэрыяльнага забеспячэння міліцыі з Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй.

УДК 343.9

***П.В. Седых***

## DARKNET – СРЕДА ДЛЯ БОРЬБЫ С ПРЕСТУПНОСТЬЮ

Функционирование DarkNet имеет продолжительную историю, по сути, равную сети Интернет. Будучи ее «глубинным» сегментом, DarkNet представляет собой совокупность частных сетей (самая известная из них сеть Tor), «закрытых» электронных ресурсов и базируется на системе анонимизации серверов, позволяющей скрыть IP-адрес пользо-